Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
____________________ А.А. Корбут
"4" студзеня 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-29 /эвуч.

# САРМАЦКАЕ МАСТАЦТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*
*спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2018

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-21 04 02-2013 па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках) і вучэбнага плана па спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтвазнаўства

**Складальнік:**

*А.Я. Корсакава*, дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*А.М. Гаўрылава,* вядучы навуковы супрацоўнік сектара міжнародных выстаў выставачнага аддзела ўстановы “Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь”;

*Ю.Д. Пярсідская*, дацэнт кафедры рэжсуры эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 15 ад 10.05.2017);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 22.02.2018)

Адказны за рэдакцыю:

Адказны за выпуск: *А.Я.Корсакава*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма вучэбнай дысцыпліны “Сармацкае мастацтва” распрацавана для студэнтаў спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтвазнаўства. Засваенне даннай вучэбнай дысцыпліны павінна спрыяць асэнсаванню мастацтва мінулага нашай краіны як неад’емнай часткі адраджэння нацыянальнай свядомасці беларусаў. Прадуктыўнае засваенне матэрыялў па дысцыпліне “Сармацкае мастацтва” забяспечваецца апорай на базавыя веды па гісторыі Беларусі, гісторыі беларускага тэатра, гісторыі сусветнага і беларускага выяўленчага мастацтва і архітэктуры. Змест вучэбнай праграмы заснаваны на храналагічным прынцыпе і разглядае пытанні фарміравання жанру партрэта ў беларускім жывапісу, тэатры на працягу стагоддзяў, асноўныя тэндэнцыі ўплыву сармацкага мастацтва на сучаснае мастацтва Беларусі. Студэнты засвойваюць агульныя рысы гістарычнай і сацыякультурнай сітуацыі эпохі сарматызму, асаблівасці “сармацкага барока” і яго існаванне ў архітэктуры, прадумовы ўзнікнення і характэрныя формы паратэатральных дзействаў, асаблівасці развіцця тэатральнай культуры XVI-XVIII стст., агульныя рысы фарміравання жанру партрэту ў беларускім выяўленчым мастацтве, характэрныя рысы і тыпы сармацкага партрэта, праводзяць аналіз знакамітых помнікаў сармацкага мастацтва.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам ОСВО 1-21 04 02-2013 па спецыяльнасці “Мастацтвазнаўства (па напрамках)” засваенне вучэбнай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне наступных *акадэмічных кампетэнцый*:

АК-18. Умець мець бачыць і сістэматызаваць факты, падзеі, з'явы сферы прафесійнай дзейнасці ў шырокім гістарычным і культурным кантэксце.

АК-19. Арыентавацца ў спецыфічных актуальных працэсах, якія адбываюцца ў сучасным мастацтве.

Таксама студэнт павінен набыць *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-8. Паважліва і беражліва ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

САК-10. Адаптавацца да новых сітуацый сацыяльна-прафесійнай дзейнасці, рэалізоўваць назапашаны вопыт, свае магчымасці.

Пасля вывучэння дысцыпліны студэнт павінен валодаць наступнымі *прафесійнымі кампетэнцыямі* і быць здольным:

ПК-11. Аналізаваць сучасны стан і перспектывы развіцця мастацтва.

ПК-13. Умець арганізаваць мерапрыемствы па прапагандзе дасягненняў мастацтва.

ПК-21. Працаваць з літаратурнымі, дакументальнымі, іканаграфічнымі, архіўнымі і іншымі матэрыяламі ў сферы сваей прафесійнай дзейнасці.

ПК-22. Працаваць у складзе творчага калектыву па рэалізацыі ідэйна-мастацкіх задум і праектаў.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – паказаць асаблівасці развіцця сармацкага мастацтва ў кантэксце мастацкай культуры Беларусі.

У межах праграмы прадугледжана вырашэнне галоўных *задач* вучэбнай дысцыпліны:

– выпрацоўка ўяўлення аб спецыфіцы сармацкага мастацтва, яго асноўных формах;

– вывучэнне праблематыкі і асноўных памятнікаў мастацкай культуры эпохі сарматызму (XVI-XVIII стст.);

– засваенне навыкаў аналізу твораў сармацкага мастацтва;

– фарміраванне сістэматычных ведаў па сармацкаму партрэту, раскрыцце заканамернасцей і асаблівасцей яго развіцця.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны:

*ведаць*

- галоўныя тэндэнцыі і напрамкі ў развіцці мастацкай культуры эпохі сарматызму;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- асноўныя этапы эвалюцыі сармацкага мастацтва, яго функцыі і асноўныя разнавіднасці.

*умець*

- сістэматызаваць важнейшыя тэндэнцыі, факты мастацкага працэса эпохі XVI-XVIII стст.;

- аналізаваць помнікі мастацкай культуры сармацкай эпохі;

- выкарыстоўваць веды, набытыя па вучэбнай дысцыпліне, у мастацтвазнаўчай практыцы.

*валодаць*

- тэрміналагічным апаратам вучэбнай дысцыпліны;

- метадамі аналізу мастацкага твору;

- спосабамі раэпрэзентацыі твораў мастацтва ў вербальнай і візуальнай формах.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія дапамагаюць прыцягненню студэнтаў у пошук і кіраванне ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, трэба вылучыць:

- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады).

У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў укаранены методыка актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Дысцыпліна “Сармацкае мастацтва” грунтуецца на ведах, якія былі набыты студэнтамі пры вывучэнні вучэбных дысцыплін: “Гісторыя Беларусі”, “Гісторыя традыцыйных мастацтваў: эпохі і стылі” і г.д.

Вучэбная дысцыпліна ”Сармацкае мастацтва” павінна садзейнічаць фарміраванню цэластнага ўяўлення аб гісторыі беларускага народа і эвалюцыі беларускага мастацтва, паказваць пераймальнасць лепшых традыцый сармацкай культуры сучасным пакаленнем беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для больш поўнага ўспрыяцця твораў мастацтва лекцыйны вучэбная дысцыпліна суправаджаецца слайд-прэзентацыямі, у рамках вывучэння вучэбнай дысцыпліны таксама прадуглежданна наведванне выстаў і музеяў, праца з асноўнай і дадатковай літаратурай, падрыхтоўка да напісання тэставага задання.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Сармацкае мастацтва" усяго прадугледжана 90 гадзін, з іх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 20 гадзін – лекцыі, 14 – семінары.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Аб'ект і прадмет вучэбнай дысцыпліны "Сармацкае мастацтва". Узаемасувязь з іншымі навукамі, междысцыплінарнае ўзаемадзееннe. Мэта і задачы, метады і метадалогія вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Тэрміналагічны апарат вучэбнай дысцыпліны. Паняцце "сарматызм", "сармацкае барока", "сармацкае тэатральнае мастацтва" і "сармацкі партрэт". Эвалюцыя сармацкага мастацтва. Значэнне вучэбнай дысцыпліны ў падрыхтоўцы мастацтвазнаўцаў. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

### ТЭМА 1. Гістарычныя і сацыякультурныя ўмовы фарміравання "эпохі сарматызму" і "сармацкага барока"

Асаблівасці культурнай сітуацыі XVI-XVIII стст. Гісторыка-сацыяльныя ўмовы фарміравання і развіцця шляхецкага саслоўя як носьбіта сармацкай культуры. Паходжанне паняцця «шляхта». Стыль барока – пануючы стыль у мастацкай культуры на тэрыторыі Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага. Развіцце "сармацкага барока", яго адметнасці. Міфалагічныя вытокі гісторыі паходжання легендарных продкаў шляхты ад сармацкіх плямен. Паходжанне шляхты як асобай касты ад рымскіх патрыцыеў.

Асноўныя рысы своеасаблівай ідэалогіі шляхты - "сарматызму". Сарматызм як дзяржаўная ідэалогія шляхты XVI-XVIII стст. Міфалагічная аснова з'яўлення гэтай ідэалогіі. Асноўныя цэнасныя арыенціры сармацкага грамадства. Абсалютная цэнасць асобы і культ сям'і, культ рыцарскай доблесці і асаблівыя, шаноўныя, адносіны да жанчыны. Культ продкаў. Арыянталізм сармацкай культуры. Кансерватыўнасць, ахоўніцтва, нацыянальная выключнасць "сарматызму" і яго ўплыў на развіццё мастацтва.

Фарміраванне сармацкага барока ў архітэктуры Беларусі XVI-XVIII стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абумоўленасць з’яўлення сармацкага мастацтва асобым кругам заказчыкаў. Шляхецтва як сацыяльны заказчык сармацкага мастацтва XVI-XVIII стст.

## ТЭМА 2. Фарміраванне паратэатральных дзействаў і тэатральнага мастацтва эпохі сарматызму

Фарміраванне паратэатральных дзействаў як часткі жыцця шляхецкага грамадства. Формы дзействаў. Урачыстыя ўезды ва ўладзення, “каруселі”,”ідэлічныя вёскі”, харугві і янычарні, тэатралізаваныя ахоты, балы і піры. “Pompa funebris” – “пахавальная помпа” – асобы пахавальны культ, шырока распаўсюджаны сярод шляхты ў XVI – XVIII стст. Асаблівы антураж цырымоніі: урачыстае ўбраннне храма, траўрныя песнапенні, убранне катафалку. Роля “архіміма” ў пахавальнай цырымоніі магнатаў. Пахавальны культ “pompa funebris” як паратэатральнае дзейства. Своеасаблівасці панэгірыка. Панэгірык як частка пахавальнага абраду. Роля аказіянальнай архітэктуры ў станаўленні скульптуры надмагілляў. Значэнне пахавальнага культа ў фарміраванні надмагільнай пластыкі эпохі сарматызму і сармацкага партрэта. Асаблівасці тэатральнага мастацтва XVI – XVIII стст. Дзейнасць прыватнаўласніцкіх тэатраў на тэрыторыі Беларусі. Творчасць У. Ф. Радзівіл і прыватнаўласніцкага тэатра ў Насвіжы. “Тэатральная прымітывы” эпохі “сармацкага барока”.

## ТЭМА 3. Скульптурная пластыка эпохі сарматызму

Надмагільная скульптурная пластыка, яе фарміраванне і развіццё на тэрыторыі Беларусі. Асноўныя тыпы скульптурных надмагілляў: ляжачая фігура ў рыцарскіх даспехах, укленчаная фігура, бюст “у лаўровым вянку“, дзіцячыя і ярусныя надмагіллі. Асаблівасці захаваных скульптурных надмагілляў на тэрыторыі Беларусі. Аналіз надмагілляў А. Гатшольда, М.К.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Радзівіла, Паўла Сапегі і яго жонак, Мікалая і Барбары Вольскіх, М.К. Радзівіла (“Сіроткі”) і інш.

Надмагільны (ці пахавальны) партрэт. Асноўныя функцыі пахавальнага і натруннага партрэта. Стылістычныя адметнасці натруннага ці трумяннога партрэта. Спецыфіка дэкору труны: форма труны, эпітафійны надпіс, сімвалічныя і алегарычныя фігуры. Эпітафійны партрэт, яго характэрныя рысы, агульнае і адметнае з натрунным партрэтам. Харугві і канклюзіі як асобыя віды партрэтнай выявы, іх роля ў пахавальным кульце, іншыя прадметы пахавальнага культа. Роля намагільнага партрэту ў пахавальнай цырымоніі. Пахавальныя партрэты Аляксандра Пацэя і Мікалая Фаўсціна Радзівіла (другая палова XVIII ст.)

## ТЭМА 4. Асаблівасці развіцця сармацкага жывапісу на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVIII стст.

Асаблівасці развіцця жывапісу на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVIII стст. Развіццё манументальнага жывапісу і іканапісу. Узаемаўплыў іканапісу і партрэтнага жанру жывапісу. Вытокі жанра партрэта на тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці развіцця жанру партрэта. Фарміраванне свецкага партрэта на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Зараджэнне сармацкага партрэта на тэрыторыі Беларусі ў эпоху Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Праблема асобы мастака – стваральніка сармацкага партрэта. Адлюстраванне шляхецкай моды ў сармацкім партрэце. Асаблівасці жаночага і мужчынскага касцюма XVI – XVIII стст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і яго адлюстраванне ў жывапісу. Развіцце графікі ў часы “сармацкага барока”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 5. Станаўленне і развіццё сармацкага партрэта: асноўныя тыпы, функцыі

Асаблівасці і адметныя рысы сармацкага партрэта. Рэпрэзентатыўнасць як асноўная рыса сармацкага партрэта – імкненне замацаваць годнасць мадэлі, яе асобныя якасці і сацыяльны статус. Функцыі сармацкага партрэта. Атрыбуты, сімвалы і эмблемы ў сармацкім партрэце. Асноўныя рысы сармацкага партрэта: рэалізм вобразаў, адсутнасць перспектывы, вялікія лакальныя каляровыя плямы, пласкасны сілуэт, дакладная манера пісьма, пільная ўвага да дэталей. Сувязь сармацкага партрэта з іканапіснымі традыцыямі. Кампазіцыйая схема сармацкага партрэта: дакладнае аблічча мадэлі; дэвіз, увасоблены ў гербе партрэтаванага; інскрыпцыя (разгорнуты надпіс ці скарочаная манаграма). Галоўная асаблівасць сармацкага партрэта – павышанная ўвага да пратакольнай дакладнасці партрэтнай характэрыстыкі. Асноўныя разнавіднасці сармацкага партрэта: паясныя, аплечныя, авальныя і партрэты "ў натуру", "у лаўровым вянку", жаночыя, рыцарскія, пахавальныя і натрунныя.

Яркія узоры сармацкіх партрэтаў XVI – XVIII стст.: князя Міхаіла Барысавіча, Юрыя Радзівіла I, Кацярыны Астрожскай, Грызельды Сапегі і яе прыёмных бацькоў Весялоўскіх, Аляксандра Астрожскага, Ігнацыя Завішы, Януша Радзівіла, Януша Антоні Вішнявецкага і Міхаіла Сервацыя Вішнявецкага і г.д. Партрэт Катажыны і Марыі Радзівіл мастака І. Шрэтара як выкананне «наіўнага» заказа, які адлюстроўваў погляды «сармацкай» шляхты. Творчасць прафесійных мастакоў Б. Стробеля, П.Д. ван Рэй, Д.Шульц як выкананне заказаў беларускай магнатэрыі.

З'яўленне партрэтных галерэй у замках і маёнтках, распаўсюджванне жанра параднага партрэта.

Позні перыяд існавання сармацкага партрэта – творчасць К. Александровіча і яго партрэты Т. Чацкага, К.С. Радзівіла, серыя партрэтаў для імення ў Заушэ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 6. Традыцыі сармацкага мастацтва ў сучаснай культуры Беларусі

Адраджэнне нацыянальнай свядомасці і культурнай спадчыны Беларусі на мяжы XX-XXI стст. Ушанаванне традыцый сармацкай культуры на сучасным этапе. Сучасныя адносіны да традыцыйных сармацкіх каштоўнасцей: павага да асобы, продкаў, жанчыны (маці), сям'і, захаванне нацыянальных традыцый і г.д.

Шляхецская мода як частка сучаснай рыцарскай культуры, дзейнасць рыцарскіх клубаў рэканструкцыі па адраджэнню сармацкіх традыцый.

Захаванне кампазіцыйнай схемы сармацкага партрэту ў сучасным жывапісу і скульптуры. Творчасць Ул. Стэльмашонка ў галіне сармацкага партрэта: серыі яго работ "Славутасці Беларусі: Радзівілы", "Ганаровыя грамадзяне г. Мінска (24 партрэта)", "Сыны Радзімы". Аналіз асноўных твораў.

Асаблівасці твораў мастакоў суполкі "Жалезны Воўк". Аналіз работ серыі "Неасармацкі партрэт", агульныя рысы і адметнасці з сармацкім партрэтам XVI-XVIII стст. Скульптурны партрэт Ф. Янушкевіча.

Сучасныя паратэатральныя відовішча: бугурты, рыцарскія турніры, балі. Тэатральныя пастаноўкі: "Выкраданне Еўропы ці Тэатр Уршулі Радзівіл" (рэж. М. Пінігін, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), "Пане Каханку" (Рэж. С. Кавальчык, НАДТ имени М.Горького).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Номер раздела, темы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінары | | |
| 1. | Уводзіны | 2 | - | | |
| 2. | ***Тэма 1.*** Гістарычныя і сацыякультурныя ўмовы фарміравання “эпохі сарматызму” і “сармацкага барока” | 2 | 2 | | |
| 3. | ***Тэма 2.*** Фарміраванне паратэатральных дзействаў і тэатральнага мастацтва эпохі сарматызму | 2 | 2 | 2 | тэст |
| 4. | ***Тэма 3.*** Скульптурная пластыка эпохі сарматызму | 2 | 2 | 2 | тэст |
| 5. | ***Тэма 4.*** Асаблівасці развіцця сармацкага жывапісу на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVIII стст. | 2 | 2 | | |
| 6. | ***Тэма 5.*** Станаўленне і развіццё сармацкага партрэта: асноўныя тыпы, функцыі | 2 | 2 | 2 | тэст |
| 7. | ***Тэма 6.*** Традыцыі сармацкага мастацтва ў сучаснай культуры Беларусі | 2 | 4 | | |
| ***Усяго:*** | | 14 | 14 | 6 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*


1. Барока ў беларускай культуры і мастацтве / НАН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Пад рэд. В.Ф. Шматава. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 304 с.: 129 іл.
2. Барышев, Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г.И. Барышев, Союз театральных деятелей Республики Беларусь. - Мінск: Навука і тэхніка, 1992. - 293 с.: ил.
3. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. / Рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1987 - 1994. - Т. 1. -2: / Рэд. тома С.В. Марцэлеў, Л.М. Дробаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987.
4. Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. / Рэдкал.: У.І. Няфёд (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983 - 1987. – Т. 1: Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. / Рэд. тома Г.І.Барышаў, А.В. Сабалеўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 496 с: іл.
5. Дадзіёмава, В.У. Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі: Вучэб. дапаможнік./ В.У. Дадзіёмава. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2000. – 256 с.
6. Корсакава, А.Я. Забавы продкаў у часы «сармацкага барока» /А.Я. Корсакава // Пачатковая школа: Штомес. навукова-метад. часопіс – 2000.- № 12 (108). – С. 29.
7. Корсакова. Е.Е. Преемственность традиций сарматского портрета в современной живописи Беларуси / Е.Е. Корсакова // Культура. Наука. Творчество: сб. науч. ст. – Минск: Белорусская Академия музыки, 2008. – С. 108-112.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Лявонава, А.К. Старажытнабеларуская скульптура / А.К. Лявонава; Акад. навук БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 208 с: іл.
9. Тананаева, Л.И. Сарматский портрет: Из истории польского портрета эпохи барокко / Л.И. Тананаева; Акад. наук СССР. ВНИИ искусствознания м-ва культуры СССР. – М.: Наука, 1979. – 303 с.: ил.
10. Хадыка, А.Ю. Непаўторныя рысы: З гісторыі беларускага партрэта. / А.Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.

*Дадатковая*

1. Александровіч, А. Вялікі скарб еднасці, або Чаму партрэт Беларусі XVII-XVIII стст. носіць назву «Сармацкага»? / А. Александровіч // Літаратура і мастацтва. - 1997. - 28 лістапада (№ 48). - С. 5.

2. Барышев, Г.И. Паратеатральные действа в частновладельческих городах Белоруссии XVIII в. / Г.И. Барышев // Вопросы культуры и искусства Белоруссии: Респ. межвед. сб. науч. трудов / М-во нар. образования БССР. Минский ин-т культуры. – Мінск: Выш. шк., 1988. – Вып. 7. – С. 107 - 118.

3. Бохан, Ю. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV– сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю. Бохан, А. Скеп’ян. – Мінск : Беларусь. 2011. – 271 с. : іл.

4. Высоцкая, Н.Ф. Искусство Беларуси XII-XVIII вв. / Н.Ф Высоцкая; Национальный художественный музей Республики Беларусь. – Мінск: Б.и., 1994. – 52 с.

5. Габрусь, Т. «Сармацкае» барока ў архітэктуры Беларусі / Т. Габрусь // Мастацтва. – 2000. - № 1. – С. 45 – 51.

6. Другое нараджэнне партрэтаў з Нясвіжа і Гродна: Каталог / Дзяржаўны мастацкі музей БССР. – Мінск: Беларусь, 1981. – 111с.

7. Жывапіс Беларусі XII – XVIII ст. / Уступ. ст. Н.Ф. Высоцкай; Склад. Н.Ф. Высоцкая, Т.А. Карповіч – Мінск: Беларусь, 1980. – 316 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Клімуць, Л.Я. Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI-XVIII стагоддзях. / Л.Я. Климуць. – Мінск : Беларусь. 2013. – 127 с. : іл.

9. Котович, Т.В. Барокко как универсальный стиль художественной культуры Беларуси XVI – XVIII столетий: Автореф. дис. …канд. искусств.: 17.00.09 / Т.В. Котович; Бел. ун-т. культуры. – Мінск, 1998. – 20 с.

10. Лявонава, А.К. Скульптурны партрэт эпохі Рэнесанса / А.К. Лявонава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння: Зб. арт. / Акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 112 – 118.

11. Лявонава, А.К. Скульптурныя надмагіллі Беларусі канца XVI – першай паловы XVII ст. / А.К. Лявонава // Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці: Зб. арт. / Акад. навук БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – С. 60 – 66.

12. Матушакайте, М. Литовская надгробная скульптура эпохи Ренессанса и раннего барокко / М. Матушакайте // Искусство Прибалтики: Ст. и исследования / Сост.: И. Соломыкова. – Таллин: Кунст, 1981. – С. 61 - 79.

13. Тананаева Л.И. Польский портрет XVII-XVIII веков (К вопросу о «примитивных» формах в искусстве Нового времени) / Л.И. Тананаева // Советское искусствознание ‘77. - М.: Сов. художник, 1978. - Вып. 1. - С. 100 - 129.

14. Тананаева, Л.И. Портретные формы в Польше и России в XVIII веке. Некоторые связи и параллели / Л.И. Тананаева // Советское искусствознание ‘81. - М.: Сов. художник, 1982. - Вып. 1. - С. 85 - 125.

15. Темперная живопись Белоруссии конца XV – XVIII вв. в собраниях Государственного художественного музея БССР: Каталог / Авт.-сост. Н.Ф. Высоцкая. – Мінск: Беларусь, 1986. – 207 с.: ил.

16. Хадыка, А.Ю. Портретная живопись Беларуси XVI-XVIII веков: Автореф. дис. …канд. искусств.: 17.00.04 / А.Ю. Хадыка; НАН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 1999. – 20 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа студэнтаў уключае напісанне рэфератаў павывучаемых тэмах, а таксама падрыхтоўку да тэста па пройдзеным матэрыяле.

Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем.

Якаснаму працэсу навучання студэнтаў па вучэбннай дысцыпліне павінна садзейнічаць дадатковае праслухоўванне, прагляд і аналіз твораў мастацтва.

## ТЭСТАВАЕ ЗАДАННЕ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «САРМАЦКАЕ МАСТАЦТВА»

1. Вызначыць асноўныя рысы ідэалогіі “сарматызму” на тэрыторыі Беларусі.
2. Абгрунтаваць паняцце “сармацкае мастацтва” ў культуры Беларусі.
3. Абгрунтаваць паходжанне тэрміна “шляхта”.
4. Які стыль з’яўляўся пануючым у мастацкай культуры часоў росквіта сармацкага партрэту? Назавіце асноўныя помнікі гэтага стылю на тэрыторыі Беларусі.
5. Азначыць асаблівасці “сармацкага барока” у архітэктуры Беларусі.
6. Асаблівасці паратэатральных дзействаў і іх асноўныя формы на тэрыторыі Беларусі.
7. Характэрныя рысы “тэатральных прымітываў” часоў барока.
8. Творчая дзейнасць Ф.У. Радзівіл: асноўныя творы і ўплыў яе дзейнасці на тэатральную культуру Беларусі.
9. Што прадстаўляе сабой “pompa finebris” і якое значэнне яна аказала на фарміраванне надмагільнай пластыкі і сармацкага партрэту?
10. Якія тыпы скульптурных надмагілляў вы ведаеце?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Хто з’яўляўся сацыяльным заказчыкам сармацкага мастацтва?
12. Назваць храналагічныя межы росквіта “сармацкага партрэта” і даць азначэнне “сармацкага партрэта”.
13. Што сабой уяўляе пахавальны (нагробны) партрэт? Яго асноўныя функцыі.
14. Вызначыць асноўныя тыпы сармацкага партрэта і яго функцыі.
15. Назваць мастакоў-прафесіяналаў, ствараўшых пад уплывам ідэалогіі «сарматызму» сармацкія партрэты?
16. Асаблівасці музыкальнай культуры часоў “сармацкага барока”
17. Роля асоба мастака ў стварэнні сармацкага мастацтва.
18. Назавіце вядомыя вам сармацкія партрэты, захаваўшыяся на тэрыторыі Беларусі.
19. Які ўплыў аказаў сармацкі партрэт на фарміраванне мастацкай культуры XX-XXI стст.?
20. Традыцыі сармацкага мастацтва ў сучасным беларускім тэатры.
21. Пераемнасць сармацкага жывапісу ў сучасным выяўленчым мастацтве Беларусі.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ

Для кантролю якасці выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тыпавыя заданні;
- тэсты па асобных раздзелах і дысцыпліне ў цэлым;
- вуснае апытанне падчас заняткаў;
- складанне рэфератаў па асобных разделах дысцыпліны;
- выступленне студэнтаў на семінарах па распрацаваных імі тэмах;
- выступленне студэнтаў на навукова-практычных, навукова-творчых канферэнцыях з падрыхтаванымі дакладамі;
- пісьмовы экзамен, вусны экзамен;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- абарона вучэбная дысцыплінаавых работ;
- дзяржаўны экзамен;
- абарона дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ